# ЗВАРОТ

## да X рэспубліканскага злёту піянераў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

Дарагія піянеры, юныя грамадзяне рэспублікі!

Паважаныя дэлегаты X злёту піянераў Беларусі!

Горача і сардэчна віншую вас, усіх піянераў рэспублікі з вялікім форумам вашай арганізацыі, жадаю поспехаў у яго рабоце, ва ўсіх піянерскіх справах!

Вашаму злёту трэба будзе зрабіць сур'ёзны выбар, вызначыць, якой будзе Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя.

Думаючы аб надзеях, якія ўскладаюць на вас старэйшыя пакаленні, я хацеў бы сказаць вось што.

Абнаўленне грамадства, усё, што робіцца цяпер намі дзеля будучыні Радзімы, вядома, патрэбна ўсім. Але больш за ўсё гэта трэба іменна вам, нашай змене. У вас усё наперадзе, для вас і сённяшні, і заўтрашні дні. Дзеля вас, у канчатковым выніку, мы і пачалі перабудову. Каб будучыня была лепшая за мінулае і сучаснае.

Што можа нас, старэйшых і маладшых, мацней ва ўсё аб'яднаць у гэты складаны для краіны і рэспублікі час? Перш за ўсё клопаты аб сваёй Радзіме, аб дабрабыце Айчыны, аб чалавеку. Заўсёды, ва ўсе часы сумленных і нераўнадушных людзей гэта хвалявала асабліва. І грамадзянінам з вялікай літары станавіўся той, хто ставіў для сябе гэту справу вышэй за ўсё. Чым раней чалавек пачынае разумець і рабіць гэта, тым хутчэй ён становіцца асобай.

Упэўнены, што дапамагчы вам зможа піянерская арганізацыя, якая мае багатую і цікавую гісторыю, і, нягледзячы на ўсе супярэчнасці, што існавалі ў нашым грамадстве, захавала патэнцыял для абнаўлення і далейшага развіцця. Не выпадкова ёй было прысвоена імя Леніна, які завяшчаў юнаму пакаленню любіць сваю Радзіму, жыць, вучыцца на рэвалюцыйных традыцыях свайго народа. Любіць Радзіму — гэта значыць любіць і цаніць яе гісторыю, яе культуру, яе мову, яе прыроду, быць беражлівым у адносінах да сваіх вытокаў.

Беларуская піянерская арганізацыя стваралася не для беларучак і маленькіх чынушаў. Яе членам традыцыйна былі ўласцівы імкненне да працы, пошуку, дружбы, клопаты аб людзях, міласэрнасць, беражлівасць. Таму і ў далейшым справы і клопаты грамадства павінны быць вашымі клопатамі. «Чалавек мае права будаваць жыццё не чакаючы, калі стане дарослым». Удумайцеся, мае юныя сябры, у гэтыя словы і дзейнічайце ў адпаведнасці з імі! Няхай вашымі галоўнымі арыенцірамі будуць: сумленнасць, карыснасць, клопаты, дабрыня, справядлівасць, высакароднасць, надзейнасць, адданасць.

Няхай ваша дзіцячая арганізацыя выдзяляецца ў грамадстве добрымі справамі і імкненнем вызначыць сваё месца ў жыцці Радзімы, сям'і, кожнага піянера; адносінамі таварыскіх клопатаў адзін аб адным, аб блізкіх і далёкіх людзях; імкненнем жыць у садружнасці са светам дарослых, дапамагаючы кожнаму свайму члену стаць грамадзянінам, які прыносіў бы карысць сабе, сям'і, грамадству. У кожнай школе і піянерскай дружыне захоўвайце і развівайце лепшыя традыцыі першых піянерскіх атрадаў, традыцыі паходаў, кастроў, гульні, рамантыкі, спалучайце іх з карыснымі справамі. Імкніцеся рабіць дабро людзям! Умацоўвайце дружбу дзяцей усіх нацыянальнасцей нашай рэспублікі і краіны. Упэўнены, што побач з вамі, як і раней, заўсёды будуць добрыя і мудрыя важатыя. Я хачу, каб вы ведалі: вашы старэйшыя таварышы, кіраўніцтва рэспублікі падтрымаюць любое пачынанне рэспубліканскай піянерскай арганізацыі, цікавае для вас і карыснае для грамадства. Дык давайце ж разам клапаціцца пра дабрабыт нашай Беларусі, пра адраджэнне і развіццё яе культуры!

Жадаю вам набірацца ведаў, быць здаровымі, шчаслівымі і карыснымі для людзей, расці ў добрым ладзе і згодзе, дарагія мае юныя сябры!

**М. ДЗЕМЯНЦЕЙ,**
**Старшыня Вярхоўнага Савета БССР.**

г. Мінск.
10 верасня 1990 г.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ